Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 237 (306)
СУБОТА
12
КАСТРЫЧНІКА
1940 г.

Цана 10 капеек.

Сёння ў Беластоку адкрываецца навуковая сесія Акадэміі навук БССР.

Працоўныя Беластоцкай області горача вітаюць прадстаўнікоў самай передавой у свеце совецкай навукі.

СЕСІЯ АКАДЭМІІ НАВУК БССР У БЕЛАСТОКУ

Сёння ў Доме партыйнай асветы адкрываецца навуковая сесія Акадэміі навук БССР, прысвечаная першай гадавіне вызвалення Заходняй Беларусі ад памешчыкаў і капіталістаў.

Працоўныя Беластока і ўсёй нашай області рады вітаць прадстаўнікоў самай передавой у свеце совецкай навукі на вызваленай зямлі. Правядзенне навуковай сесіі Акадэміі навук БССР у Беластоку яшчэ раз сведчыць аб вялікіх клопатах партыі і ўрада аб вызваленым народзе.

Совецкая навука жыве адзіным жыццём з народам. Яна прызвана практычна вырашаць пытанні соцыялістычнага будаўніцтва. Калі навука пры капіталізме выконвала заказы эксплаататараў, геній чалавека быў падпарадкаваны інтарэсам капітала, то зусім іншае цяпер пры соцыялізме. Велізарнейшыя пабудовы: складанейшыя прадпрыемствы, абвадняючыя палі і навігацыйныя каналы, магутнейшыя электрастанцыі і выдатныя лакамативы не толькі ствараюцца свабодным комуністычным геніем, але і служаць непасрэдна інтарэсам народа. На шчасце народа свецяць ісонца, воды рухаюць турбіны, з руд выплаўляюцца лепшыя сталі.

Нашай партыяй на вырашэнне пастаўлены важнейшыя задачы далейшага развіцця гаспадаркі і культуры. Усе чэсныя патрыёты нашай радзімы, не пакладаючы рук, працуюць над умацаваннем абароназдольнасці краіны. Над вырашэннем гэтых задач павінна працаваць і наша навука. Ад совецкага вучонага патрабуецца наватарства, смелае дзярзанне, ісці ўперад, новае заваяванне навейшым.

Народы Заходняй Беларусі дажылі да шчаслівых і радасных дзён. Навекі канула галеча, эксплаатацыя, бескультур'е і невуцтва разам з сваім носьбітам — капіталізмам. Неабсяжныя прасторы, гарады і вёскі азораны цяпер яркімі крэмлёўскімі рубінавымі зорамі. Людзі ўпершыню ўбачылі свята, пазналі шчасце і радасць жыцця. Дзеці працоўных беларусоў, палякаў, яўрэяў цяпер займаюцца ў совецкіх школах на роднай мове. Адкрыты тэхнікумы і ВНУ. Паэты складаюць песні аб народзе, аб вялікім Сталіне і доблеснай Чырвонай Арміі. На ураджайных палях працуюць трактары, камбайны. Заводы і фабрыкі вялікага горада працуюць поўным ходам, выпрацоўваюць мільёны метраў тканін, скураныя тавары, запалкі, цэмент, фанеру і многія іншыя прадметы шырокага спажывання.

Па Днепра—Бугскаму каналу плывуць караваны суднаў, гружаныя таварамі. На вуліцах гарадоў не блукаюць беспрацоўныя, шукаючы кавалка хлеба, а ідуць бадзёрыя, гордыя за сябе і сваю соцыялістычную радзіму, стаханаўцы—рабочыя соцыялістычных прадпрыемстваў, служачыя совецкіх устаноў.

У былой польскай дзяржаве на сапраўдную навуку глядзелі як на крамолу. І гэта зразумела. Капіталізм баіцца сапраўднай навукі. Толькі ў Совецкім Саюзе, дзе гаспадаром краіны з'яўляецца народ, створаны ўсе ўмовы для развіцця навукі.

Беларусь, якая пры царызме была жабрацкай і цёмнай, за годы совецкай улады развіла навуку, культуру, на небывалую вышыню ўзняла прамысловасць і сельскую гаспадарку. Беларусь пакрылася густой сеткай навуковых і культурных устаноў. Беларускі народ пры панаванні капіталізма нават і марыць не мог аб стварэнні Акадэміі навук. А партыя Леніна—Сталіна, совецкая ўлада стварылі для беларускага народа Акадэмію навук БССР, таленавітым людзям з народа дапамаглі стаць вучонымі.

Маладая Акадэмія навук БССР дасягнула ўжо вялікіх поспехаў. Пры ёй арганізавана дзесяць навукова-даследчых інстытутаў і дзве навуковых групы. Інстытуты вядуць вялікую навуковую работу. Інстытутам хіміі распрацаван метад атрымання спірту з гнілой драўніны. Гэтым метадам ужо карыстаецца наша прамысловасць. Інстытутам торфу распрацавана праблема пераводу трактара на тарфяное паліва. Выпрабаванні далі станоўчыя вынікі. На тарфяным паліве працуюць ужо аўтамашыны ГАЗ—АА. Інстытут паспяхова працуе цяпер над праблемай каксавання торфу. Вядуцца работы па канструкцыі новых торфаздабываючых машын.

Удзельнік Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве, навукова-даследчы інстытут соцыялістычнай сельскай гаспадаркі працуе над увядзеннем правільных севазваротаў у калгасах і саўгасах.

Інстытутам біялогіі выведзены новыя сарты бульбы, у прыватнасці, сорт «Піонер», які дае высокі процант крухмалу і вялікі ўраджай.

Паспяхова вырашаецца праблема ўвядзення ў БССР пасеваў кок-сагыза. Кок-сагыз ужо сеюць многія калгасы і саўгасы рэспублікі. Каўчуковая расліна коксагыз знаходзіць шырокае распаўсюджванне.

Вялікая работа праведзена інстытутамі гісторыі і літаратуры і мовы. Падрыхтаваны і здадзены ў друк падручнікі для сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў па гісторыі Беларусі і гісторыі беларускай літаратуры. Кнігі выйдуць з друку ў пачатку 1941 года. Працуе камісія над укладаннем правапісу беларускай мовы.

У канцы гэтага года выдаецца атлас БССР, распрацаваны інстытутам эканомікі.

Шырока вядомы працоўным Беларусі і ўсяго Совецкага Саюза імёны акадэмікаў Нікольскага, Перцава, Ліабошчыка, Шкатэлава, Ціцова, Ануфрыева, Маркава, Гаўсмана, прафесараў Сітэрмана, Леонава, народных паэтаў-акадэмікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Выраслі маладыя, здольныя навуковыя кадры. Інстытут літаратуры і мовы ўзначальвае кандыдат філалагічных навук тав. Барысенка. Комуніст, член-карэспандэнт Акадэміі навук тав. Шэмпель напісаў 10 каштоўных навуковых прац. Други малады вучоны тав. Ерафееў напісаў 12 прац. Паспяхова працуюць у літаратуры тт. Ларчанка, Фігловская.

Наша партыя і совецкі ўрад бацькоўскімі клопатамі акружаюць работнікаў навукі. 8 работнікаў Акадэміі навук БССР узнагароджаны ордэнамі.

Перадавая ў свеце совецкая навука смела ідзе ўперад. Яна не прызнае фетышаў, не баіцца ўзняць руку на аджываючае, старое. Совецкія вучоныя ў перыяд зараджэння стаханаўскага руху з усёй рашучасцю ўступілі ў бой з абаронцамі старых прадзельных тэхнічных норм. Абагульваючы і даследуючы вопыт работы стаханаўцаў, яны памагалі партыі і совецкаму народу шырока развіць стаханаўскі рух.

Працоўныя Беластока і області, вітаючы сёння на вызваленай зямлі прадстаўнікоў совецкай навукі, шчыра жадаюць ім далейшых поспехаў у рабоце на карысць соцыялістычнай радзімы, чакаюць яшчэ большай дапамогі ў развіцці прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры.

Няхай жыве самая передавая ў свеце совецкая навука!

Няхай жыве Чырвоная Армія — вызваліцельніца працоўных Заходняй Беларусі!

Няхай жыве наш вялікі настаўнік таварыш Сталін!

Сустрэча ўдзельнікаў сесіі Акадэміі навук БССР у Беластоку

Учора ў 22 гадзіны з Мінска ў Беласток прыехалі ўдзельнікі навуковай сесіі Акадэміі навук БССР, якая сёння адкрываецца ў Беластоку. Сярод прыбыўшых: прэзідэнт Акадэміі навук БССР акадэмік Горэў, віцэ-прэзідэнт акадэмік Леонаў, акадэмікі Вальфсон, Пічэта, Перцаў, Гаўсман. Кедраў—Зіхман і іншыя, члены-карэспандэнты Акадэміі навук і навуковыя работнікі.

На вакзале прыбыўшых сустракалі сакратары абкома партыі тт. Ігаеў і Сямёнаў, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР т. Пятроўская, сакратар гаркома партыі т. Раманаў, прадстаўнікі друку.

Провады прызыўнікоў у Чырвоную Армію

Шчаслівай дарогі!

Гучалі радасныя, бадзёрыя песні. Моладзь мястэчка Індуры, бацькі і родныя сабраліся праводзіць сваіх лепшых пасланцоў вызваленага народа ў гераічную Чырвоную Армію. Бацькі, таварышы, знаёмыя, дзяўчаты віталі маладых воінаў, давалі ім наказ даражыць аказаным давер'ем, дастойна несці высокае званне совецкага воіна. Бацька прызыўніка калгаснік Міхаэль Сальмуна расказаў аб цяжкай бязрадаснай службе ў былой польскай арміі. Цяпер ён з радасцю даў наказ свайму сыну:

— Глядзі, сынку, не асаром свайго старога бацьку і наша мястэчка. Будзь верным байцом і пільна ахоўвай рубяжы нашай радзімы.

Прызыўнікі з чэсцю абавязаліся выканаць даны ім наказ. Яны абяцалі быць выдатнікамі баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

Гукі гармонікі, звонкія песні моладзі далёка нясуцца за вёску Лоша. Старыкі і моладзь праводзяць свайго маладога патрыёта Аляксея Лубоўскага ў Чырвоную Армію. І толькі далёка за вёскай развіталіся лашанцы з сваім аднавяскоўцам. Маладому байцу прынеслі букеты жывых кветак. Цёплыя пажаданні... Бацькоўскі наказ...

Вакзал... На чыгунцы стаяць пасажырскія вагоны, гатовыя да адпраўлення. На кожным з іх белая трафарэтка: для ваеннаслужачых. На перон праводзіць прызыўнікоў сабралося многа народа, аркестр выконвае баявыя песні, іх падхапляюць прызыўнікі.

Сярод адпраўляючыхся ў часць прызыўнікоў—передавікі, стаханаўцы вытворчасці. Вось лепшы токар-стаханавец табачнай фабрыкі Загер. Побач з ім стаханавец велазавода Абрам Бромберг і многа іншых.

Апошнія мінуты... Чутны бацькоўскія наказы, просьбы пісаць, шчырыя поціскання рук. Машыніст даў адпраўны сігнал. Паравоз крануўся і пачаў набіраць хуткасць.

Г. Лупсякоў,
М. Партной.

Бацькоўскі наказ сыну-прызыўніку

Святочна ўпрыгожан клуб беластоцкага тэкстыльнага камбіната № 5. Сюды сабраліся на вечар амаль усе рабочыя для провадаў прызыўнікоў у Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію.

Вечар, прысвечаны провадам, адкрыў сакратар партыйнай арганізацыі тав. Глухоўскі. Ва ўступнай прамове ён расказаў аб Чырвонай Арміі, аб моладзі, якая ідзе ў рады гераічнай Чырвонай Арміі.

— Мы праводзім сёння нашых лепшых маладых рабочых у Чырвоную Армію,—сказаў тав. Глухоўскі—праводзім у армію, якая вызваліла нас ад гнёту польскіх паноў і капіталістаў. І мы ўпэўнены, што нашы маладыя байцы будуць чэсна служыць совецкай радзіме.

На пятым камбінаце прызвана ў РСЧА 29 чалавек. Сярод іх — 24 стаханаўцы, якія штодзённа выконвалі свае нормы на 130—140 процантаў.

З прывітальным словам ад бацькоў прызыўнікоў выступіў 60-гадовы тав. Міркуцкі. У сваім выступленні ён заявіў:

— Жывучы ў былой панскай Польшчы, я не раз збіраўся памірць. Але зараз аб гэтым і не думаю. Пры совецкай уладзе ў мяне паявіліся новыя маладыя сілы. І вось сёння мы праводзім свайго сыну ў рады Чырвонай Арміі, якая толькі год назад прынесла нам радасць і шчасце. Праводзячы ў Чырвоную Армію свайго адзінага сына, я яму гавару: служы, сын, чэсна і самааддана, не дапускай ніводнага выпадку недысцыплінаванасці. Будзь патрыётам нашай радзімы!

Прызыўнікі заверылі рабочых камбіната, што бацькоўскія наказы будуць з чэсцю выкананы.

На вечары прызыўнікам былі ўручаны падарункі.

Г. Шыленка.

БУДЗЕМ З ЧЭСЦЮ НЕСЦІ ЗВАННЕ БАЙЦА

50 чалавек прызыўнікоў, рабочых і служачых 2-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната прыняты ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

На камбінаце адбыўся вечар, прысвечаны провадам будучых байцоў. Аб цяжкай долі сыноў працоўных у радах армій капіталістычных краін расказалі прысутным намеснік дырэктара камбіната тав. Юндаў і старшыня фабкома тав. Сакольскі.

Затым слова ўзяў прызыўнік тав. Пырко. Ён заверыў калектыў камбіната, што будзе з чэсцю несці высокае званне байца Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Прызыўнік тав. Вальчук заявіў:

— Дзень, у які прызыўная камісія прызнала мяне годным да ваеннай службы, быў для мяне вялікім святам. Я тады паімчаўся дамоў, каб хутчэй падзяліцца сваёй радасцю з блізкімі.

Апошняй выступіла сакратар партарганізацыі тав. Дзянісава. Яна заклікала будучых байцоў не традзіць сувязі з камбінатам, пісаць паболей аб сваім новым жыцці ў радах Чырвонай Арміі.

З свайго боку прызыўнікі прасілі паведамляць ім аб ходзе выканання калектывам камбіната прынятых на сябе соцабавязацельстваў.

У заключэнне ўсім прызыўнікам былі раздадзены падарункі.



Лепшая вінтаўшчыца 17-ай беластоцкай тэкстыльнай фабрыкі Б. В. Бехоўская, сістэматычна перавыконваючая норму на ўшчыльненай рабоце. Фота А. Сапіра.

Лепшую моладзь пашлём у рамесленыя вучылішчы

ЛОМЖА. (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта). Рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі Ломжынскага завода сельскагаспадарчых машын, як і працоўныя ўсёй нашай краіны, аднадушна вітаюць Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах.

У час абмеркавання Указа стаханавец-ліцейшчык тав. Кіндэрскі сказаў:

— Пры ўладзе памешчыкаў і капіталістаў наша моладзь як гарадская, так і вясковая не магла марыць аб бясплатным абучэнні,—таміла многа было беспрацоўных. Яны вымушаны былі, як міласці, прасіць у фабрыканта работы. Толькі пры совецкай уладзе моладзь атрымала магчымасць набыць кваліфікацыю і вучыцца за кошт дзяржавы.

Вылучэнец-стаханавец тав. Валіскевіч з радасцю заявіў:

— Моладзь заходніх абласцей Беларусі атрымала права набываць кваліфікацыю толькі пры совецкай уладзе. Я памятаю, як у былой Польшчы беспрацоўныя стаялі ў дзвярах былога магістрата і прасілі работы. Але замест работы яны атрымоўвалі бізуны.

Аднадушна і з вялікім задаволеннем рабочыя і служачыя Ломжынскага завода сельскагаспадарчых машын пашлюць сваіх сыноў у ствараемыя рамесленыя вучылішчы.

КАЛЕКТЫЎ ПЯТАГА КАМБІНАТА ВІТАЕ ЎКАЗ

На 5-м беластоцкім тэкстыльным камбінаце былі праведзены сходы рабочых, на якіх абмяркоўвалі Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета аб стварэнні дзяржаўных працоўных рэзерваў. На сход 7 кастрычніка сабраліся ткачы першай змены і майстры. Пасля чыткі тэкста Указа выступалі рабочыя.

Ткач тав. Бусловіч, які мае 40-годы вытворчы стаж, заявіў:


— Я добра ведаю, што значыць для дзяцей рабочых атрымаць кваліфікацыю. Наша-ж дзяржава бярэ на сябе ўсе клопаты па абучэнню дзяцей кваліфікацыі. Добрая, важная справа.

Ткач тав. Шустэр расказаў аб становішчы моладзі ў капіталістычных краінах, у прыватнасці ў былой панскай Польшчы. Ён указаў, што перад моладдзю былі зачынены вароты фабрык, моладзь была без кваліфікацыі, без перспектывы. Сапраўдныя клопаты аб моладзі магчымы толькі ў нашай краіне соцыялізма, дзе назаўсёды знікла беспрацоўе.

8 кастрычніка сходы праводзіліся ў аддзелачнай і фетравай фабрыках. Усюды Указ Вярхоўнага Савета СССР выклікае гарачае адабрэнне. Рабочыя разумеюць велізарную карысць, якую атрымае наша соцыялістычная прамысловасць пры стварэнні магутных дзяржаўных працоўных рэзерваў.

Е. Аронскі.

Па Совецкай краіне



Від на мост праз раку Нёман у адным з буйнейшых гарадоў Літоўскай ССР—Каунасе.

Фота Д. Чарнова. Фотахроніка БЕЛТА.

ЖУРНАЛ ЭСТОНСКІХ ПІОНЕРАЎ

ТАЛІН. У Таліне вышаў першы нумар журнала «Піонер» — орган Цэнтральнага Камітэта комсамола Эстоніі. (ТАСС).

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ СТУДЫЯ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

ПЕРШАЯ ЧЫРВОНАСЦЯЖНАЯ АРМІЯ. (ТАСС). Пры Доме Чырвонай Арміі пачалося будаўніцтва спецыяльнага будынка для чырвонаармейскай мастацкай студыі. Аснована ў пачатку бягучага года, гэта студыя хутка заваявала аўтарытэт сярод камандзіраў і чырвонаармейцаў.


Нядаўна тут адкрылася выстаўка работ маладых жывапісцаў. К гэтаму часу вучні студыі падрыхтавалі галярэю цікавых карцін. Многа работ прысвечана штурму сопкі Заазёрнай. Незабыўны вобраз Героя Совецкага Саюза Пажарскага ўзноўлен чырвонаармейцам тав. Зензінавым.

Работу студыі высока ацэньвае камандаванне. Генерал-палкоўнік Герой Совецкага Саюза тав. Штэрн, запісваючы ў кнігу водгукаў свае ўражанні, адзначыў карціны чырвонаармейскіх мастакоў Усманава—«Чырвонасцяжны ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі на сопцы Заазёрнай», Герфанава—«Герой Пажарскі», Швецава—«Подвіг Героя Совецкага Саюза Бамбурава» і рад іншых твораў.

У МЯСЦАХ ГЕРАІЧНЫХ БАЁЎ

ЗАПАРОЖЖА. (ТАСС). 14 кастрычніка спаўняецца 20 год з дня разгрому врангелеўскіх полчышч пад Кахоўкай. У сувязі з гэтай датай у калгасах Запарожскай області праходзяць сходы, на якіх выступаюць удзельнікі баёў з Врангелем.

За апошні час папаўнілася наведанне гістарычнага музея ў Мелітопалі, дзе захоўваюцца дакументы гэтай слаўнай эпапеі. У музей часта прыязджаюць экскурсіі калгаснікаў. Яны заходзяць і на станцыю Мелітопаль, дзе захаваўся пакой штаба тав. Фрунзе, ператвораны цяпер у музей.



Загадчык конефермы калгаса «Кастрычнік» (Прапойскі раён, Магілёўскай області), дэпутат Вярхоўнага Савета СССР ордэнаносец Н. Е. Батоўкін выязджае ў поле для праверкі правільнасці скарыстання коней на палявых работах.

Фота Вульфовіча. Фотахроніка БЕЛТА.

XIV З'ЕЗД ЛКСМБ

Прамова Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. НАТАЛЕВІЧА Н. Я. *)

Таварышы! Тут, на XIV з'ездзе комсамола, прысутнічае лепшая частка моладзі Беларусі. Вы сабраліся абмеркаваць актуальнейшыя пытанні работы комсамола Беларусі. Усе выступленні таварышоў зводзяцца да аднаго: як лепш арганізаваць выхаваўчую работу сярод комсамольцаў, каб кожны комсамолец больш актыўна ўдзельнічаў у соцыялістычным будаўніцтве і прадукцыйней працаваў, каб кожны комсамолец практычнай творчай работай апраўдаў высокае і пачотнае званне члена Ленінскага Комуністычнага Саюза Моладзі. Гэта верная пастаноўка пытання.

Ва ўмовах другой імперыялістычнай вайны, калі пажарышча вайны палыхае на ўсходзе і на захадзе, на поўначы і на поўдні, калі ў гэту вайну ўцягнута больш палавіны насельніцтва зямнога шара, калі вастрыё імперыялістычнай вайны кожную мінуту можа быць павернута супроць Совецкага Саюза, пытанні павышэння прадукцыйнасці працы, пытанні павышэння абараназдольнасці нашай краіны павінны стаяць у цэнтры ўвагі.

Вы нарадзіліся свабоднымі і жывеце ў шчаслівы час, у сталінскую эпоху, калі наша краіна ўступіла ў паласу завяршэння будаўніцтва соцыялістычнага грамадства і паступовага пераходу да комунізма. Вы самі гаспадары, будаўнікі свайго поўнакроўнага, яркага і шчаслівага жыцця, вяршыцелі свайго лёсу.

Большасць з вас тут прысутных (за выключэннем комсамольцаў заходніх абласцей БССР) не ведае капіталістычнай эксплаатацыі, не ведае беспрацоўя і голаду. Аб усіх вас клапоціцца партыя і ўрад, наша совецкая дзяржава і лепшы друг совецкай моладзі вялікі Сталін. **(Доўгія апладысменты).**

Усе выступаючыя тут на з'ездзе многа гаварылі аб авангарднай ролі комсамольцаў у соцыялістычным будаўніцтве, аб павышэнні палітычнага, культурнага і тэхнічнага ўзроўню совецкай моладзі. Гэта правільна. Сучаснае комуністычнае грамадства адрозніваецца ад першабытнага комунізма тым, што яно будуецца на аснове самай перадавой навукі і тэхнікі. Непісьменныя не могуць пабудаваць комунізма. Нашай краіне патрэбны шматлікія кадры, патрэбны людзі навукі—акадэмікі, прафесары, інжынеры, тэхнікі, педагогі; патрэбны культурныя, тэхнічна граматныя рабочыя, патрэбны кадры,—кадры, авалодаўшыя не толькі тэхнікай, але і тэорыяй марксізма-ленінізма. Толькі такія кадры могуць добра працаваць і пабудаваць комунізм.

У гэтай сувязі я і хачу спыніць увагу з'езда на некаторых пытаннях выхаваўчай работы ў комсамоле.

Істотны недахоп выхаваўчай работы—гэта разрыў тэарэтычнай падрыхтоўкі з практыкай. Вучоба ў школах, прапаганда ў гуртках у нас праводзіцца абстрактна, часта без увязкі з практыкай работы комсамольцаў і вытворчым жыццём. Па сутнасці ў вядомай ступені працвітае начотніцтва. Многія нашы педагогі, кіруючыя таварышы ўпускаюць з-пад увагі ўказанне Леніна, які жорстка змагаўся з зуброжкай, начотніцтвам і абстрактнасцю ў вучобе. У сваёй прамове на III-м з'ездзе комсамола ў 1920 годзе ён паказаў нам, чаму і як выхоўваць комсамольцаў. Ён гаварыў, што без вучобы няма комунізма, а навучыць людзей таму, што выкладзена ў кніжках і брашурах без увязкі з практычнай работай—значыць скажаць комуністычнае выхаванне. Ад падобных метадаў Владзімір Ільіч Ленін нас перасцерагаў:

«Калі-б толькі вывучэнне комунізма заключалася ў засваенні таго, што выкладзена ў комуністычных працах, кніжках і брашурах, то тады занадта лёгка мы маглі-б атрымаць комуністычных начотчыкаў ці хвастуноў, а гэта скрозь і ўсюды прыносіла-б нам шкоду і страты, таму што гэтыя людзі, навучыўшыся і начытаўшыся таго, што выкладзена ў комуністычных кнігах і брашурах, аказаліся-б няўмеючымі злучыць усе гэтыя веды і не сумелі-б дзейнічаць так, як таго сапраўды комунізм патрабуе».

Няма чаго, таварышы, граха таіць, ёсць у нас такія комсамольцы, нават кіруючыя работнікі, якія ў патоку прыгожых слоў гатовы патапіць жывую справу. Свае выступленні такі чалавек звычайна пачынае з пытання міжнароднага маштаба. Ён нічога не забудзе, нічога не ўпусціць. Ён красамоўна раскажа вам аб комуністычным выхаванні, аб соцспаборніцтве, стаханаўскім руху, аб авангарднай ролі комсамольцаў і т. д. А калі яго спытаеш, колькі комсамольцаў, занятых у сельскай гаспадарцы, з'яўляюцца стаханаўцамі і ўдарнікамі,—ён не ведае; колькі комсамольцы выпрацавалі працадзён у калгасе,—таксама не ведае; колькі комсамольцаў датэрмінова разлічыліся з дзяржавай па ўсіх відах паставак і плацяжоў,—таксама не ведае; колькі выпісваюць газет, якую літаратуру чытаюць комсамольцы,—таксама не ведае.

Такія людзі, на вялікі жаль, аказаліся нават на з'ездзе. Вось, напрыклад, выступленні некаторых таварышоў з заходніх абласцей нашай рэспублікі. Прызнаюся шчыра, што калі-б старшынствуючы не папярэдзіў, што гэта таварышы з заходніх абласцей, то па зместу іх выступленняў нельга было-б даведацца, якую вобласць, раён яны прадстаўляюць. Так занадта агульнымі і неканкрэтнымі былі іх выступленні. Яны не гаварылі аб практыцы сваёй работы. Гэта яркі паказчык таго, што аб становішчы спраў у вобласці, у раёне таварыш не ведае. Папракнуць іх тым, што яны палітычна няверна выступалі, нельга. Яны даволі падрабязна і правільна расказвалі і аб выхаванні моладзі і аб авангарднай ролі комсамола, наогул аб усім патроху, і атрымалася нібы кругла і добра, а вось самага галоўнага яны не сказалі.

Чаму-б, напрыклад, сакратару Беластоцкага абкома не расказаць, колькі прынята ў комсамол беларусаў, палякаў, яўрэяў, якую работу вядзе комсамол сярод той часткі моладзі, якая яшчэ знаходзіцца пад уплывам варожых ідэй і поглядаў, аб антырэлігійнай рабоце сярод моладзі, аб многім іншым цікавым і важным? Гэтага сказана не было. Чаму? Ды таму, што гэты таварыш не ведае сапраўднага становішча рэчаў, мала бывае ў пярвічных арганізацыях, мала працуе з моладдзю. Вось канкрэтны прыклад разрыву тэорыі з практыкай.

Ленін вучыў, што Саюз комуністычнай моладзі сваю адукацыю, сваё вучэнне і сваё выхаванне павінен злучыць з працай рабочых і сялян, што толькі ў працы разам з рабочымі і сялянамі можна стаць сапраўднымі комуністамі.

Некаторыя-ж нашы кіраўнікі комсамола забываюць гэта ўказанне вялікага правадыра і часта сваю ролю зводзяць да ролі педагога казённай гімназіі. Яны не ведаюць, не цікавяцца тым, што прадстаўляюць комсамольцы данай арганізацыі на вытворчасці, прамысловасці, сельскай гаспадарцы, як яны змагаюцца за выкананне вытворчага плана фабрыкі, завода, калгаса, а значыць, як апраўдваюць сваё высокае званне комсамольцаў.

Не ведаючы гэтага, такі кіраўнік не можа правільна кіраваць комсамольскай арганізацыяй, не можа правільна ўплываць на комсамольцаў і выхоўваць іх.

У сістэме выхавання і абучэння комсамола трэба звярнуць увагу і на тую акалічнасць, што ў пачатковых і сярэдніх школах да гэтага часу яшчэ нізкая якасць вучобы. Лёгкія, павярхоўныя адносіны да якасці вучобы, якія існуюць у некаторых школах, параджаюць бязграматныя людзі, такія настаўнікі, якія самі нічога не ведаюць і не жадаюць ведаць.

Воблік такога настаўніка я магу тут прадэманстрыраваць. На рэспубліканскай нарадзе актыва настаўнікаў (не наогул нарады настаўнікаў, а актыва) настаўнік падае такую запісачку. Я яе вам прачытаю даслоўна: «Как поступить в таким случаи, если в школе нащитывается 15 учеников и растояния ат 2-й школы 8 км.».

У адным сказе роўна шэсць памылак.

Падобнага роду настаўнікі нам добрых кадраў не створаць і пабудаваць комунізм не толькі не дапамогуць, а будуць справу будаўніцтва комунізма тармазіць. Такіх настаўнікаў трэба выганяць з школы. Не патрэбны нам такія настаўнікі, якія калечаць людзей, якія, будучы самі бязграматнымі, выпускаюць няграматных людзей.

Комсамол павінен аб'явіць паход за высокую якасць вучобы, за глыбокія веды вучняў у нашых совецкіх школах.

Трэці недахоп выхаваўчай работы нашай моладзі—гэта адсутнасць пэўнай сістэмы прывіцця працоўных навыкаў навучаючымся.

Задача школы і ўсёй сістэмы выхаваўчай работы заключаецца ў падрыхтоўцы труджанікаў соцыялістычнага грамадства, актыўных будаўнікоў комуністычнага грамадства. Гэта значыць, што з самых ранніх год дзяцінства, а потым юнаку трэба прывіваць любоў да працы, каб ён не грэбаваў ніякай фізічнай работай, каб ён усякую працу лічыў справай чэсці і доблесці. Трэба прама сказаць, што ў гэтых адносінах наша школа нічога не зрабіла, і комсамол таксама. А ў нас часцей за ўсё бывае наадварот—вельмі многія маладыя людзі недалюбліваюць фізічную работу, і замест таго, каб, скончыўшы семігодку ці дзесяцігодку, пайсці на вытворчасць, устрайваюцца ў канцылярыях. Гэтыя чыстаплюйчыкі думаюць, што комунізм можна будаваць у белых пярчатках.

У рэзультаце ў нас нярэдкі выпадкі, калі юнак, скончыўшы сярэднюю навучальную ўстанову, прыходзіць у Чырвоную Армію, не ўмеючы раскалоць палена дроў, не ўмеючы зашыць сабе штаны.

Адзін з камандзіраў — удзельнік баёў на фінскім фронце, расказаў пра такі выпадак. Адно падраздзяленне назначылі ў разведку. Загадана было ўсе кацялкі і лапаткі зашыць так, каб яны не бразгалі. Усе падрыхтаваліся і пайшлі ў разведку. І раптам стук кацялка, лапаткі. Фіны адразу знайшлі разведку, пачалі страляць, і разведка сарвалася. А потым, калі пачалі даведвацца ў чым-жа справа, то высветлілася, што адзін такі чыстаплюй, аказалася, не змог зашыць кацялок і лапатку, не ўмеючы шыць. Гэтыя людзі гатовы разглядаць Чырвоную Армію як універсітэт для прадаўжэння сваёй агульнай адукацыі.

Усе гэтыя недахопы выхаваўчай работы параджаюць у моладзі павярхоўнае і лёгкае ўяўленне і адносіны да работы, да жыцця. Яны паслабляюць волю да барацьбы.

Не ў белых пярчатках, а са зброяй у руках, велізарнейшымі фізічнымі намаганнямі, у парахавым дыму і агні грамадзянскай вайны, у гразі, у холадзе і голадзе, барацьбе супроць тыфознай вошы, знешняй і ўнутранай контррэволюцыі вашы бацькі і браты адстаялі заваёвы Кастрычніка. І зараз мы будуем новае грамадства ў барацьбе супроць сусветнага капітала.

Я думаю, што комсамольцы павінны не толькі адчуваць адказнасць за недахопы ў выхаваўчай рабоце, але і прыняць рашучыя, дзейсныя меры да наладжвання сапраўды комуністычнага выхавання сярод навучаючыхся, сярод моладзі наогул.

У сувязі з гэтымі недахопамі ў выхаваўчай рабоце сярод моладзі, асабліва ў школах, некалькі слоў аб совецкім патрыятызме.

Мы многа гаворым аб совецкім патрыятызме, аб любві да радзімы, да партыі і ўрада. Многія гавораць моладзі, навучаючымся ў прыватнасці :«Вы павінны быць такімі патрыётамі, як: Чкалаў, Папанін, Осіпенка, Раскова». І наша моладзь хоча быць такімі патрыётамі. Але што трэба зрабіць, каб стаць такімі патрыётамі — не гавораць. І ў рэзультаце маладыя людзі, не скончыўшы сярэднюю навучальную ўстанову, у парыве патрыятызма, гатовы ўступіць у лётную школу, дабравольна пайсці ў РСЧА, не маючы абсалютна ніякіх ведаў.

У гэтым выпадку пачуцці совецкага патрыятызма накіроўваюцца па няверпаму шляху.

Совецкі патрыятызм праяўляецца не на словах, а на справе, на практычнай дзейнасці і рабоце кожнага маладога патрыёта. Калі комсамолец не ўдарнік і не стаханавец на вытворчасці, то гэта балбатун, а не патрыёт. Калі калгас несвоечасова ўбірае ўраджай, не разлічваецца своечасова з дзяржавай, гноіць хлеб, калі фабрыка дае брак, не выконвае вытворчы план, то тут совецкім патрыятызмам і не пахне.

Выхоўваць моладзь у духу сапраўднага совецкага патрыятызма—адна з важнейшых задач комсамола, але выхоўваць так, каб кожны таварыш не словамі, а справай пацвярджаў, што ён патрыёт вялікай радзімы соцыялізма, што ён не баіцца труднасцей, пойдзе насустрач труднасцям і пераможа іх, што ён гатоў у любы момант аддаць жыццё за справу народа, за справу любімай партыі Леніна—Сталіна. **(Апладысменты).**

Таварышы комсамольцы, паляпшайце і ўмацоўвайце справу комуністычнага выхавання, практычна выконвайце заветы Владзіміра Ільіча Леніна — вучыцца комунізму, змагайцеся за тое, каб нашу моладзь выхоўваць сапраўднымі патрыётамі — большэвікамі, актыўнымі труджанікамі і барацьбітамі за справу комунізма! **(Бурныя апладысменты).**

*) Прамова друкуецца па скарочанай стэнаграме.



Стаханаўка - матальшчыца 17 беластоцкай тэкстыльнай фабрыкі Р. Б. Шэвах, выконваючая норму на 150 процантаў, за работай.
Фота А. Сапіра.

Энтузіясты плюшавай фабрыкі

У ткацкім цэху адной з прыкладных работніц лічыцца тав. Бароўская. Яна штодзённа перавыконвае сваю норму. З ёю ў адным цэху працуе яе сястра Сцефаніда. Апошняя, дзякуючы дапамозе сваёй сястры, стала стаханаўкай.

Ткацкі цэх, у якім працуюць сёстры Бароўскія, мае многа выдатных стаханаўцаў — перадавых людзей соцыялістычнай вытворчасці. Сярод іх асабліва выдзяляецца старая работніца Вераніка Ярдзях, якая 30 год прапрацавала на вытворчасці. Яе ўмела арганізаваная праца—прыклад для астатніх. І не дзіва, што тав. Ярдзях у асобныя дні дасягае надзвычайна высокай прадукцыйнасці працы. Яна выконвае паўтары нормы. Яе прыкладу следуе Вайцахоўскі, які выконвае норму на 158 процантаў.

Некалькі тыдняў таму назад матальны і снавальны аддзелы ткацкага цэха перайшлі на здзельную работу, і ўжо ёсць плады стаханаўскіх стаpанняў. Лепшых вынікаў у асваенні нормы выпрацоўкі дабіліся старыя кадравыя рабочыя. Работніца Пліс працуе на гэтай фабрыцы звыш чатырох дзесяткаў год. Яна на вельмі адказным участку работы — робіць сноўку шоўкавай асновы. Старая работніца не задавольваецца асваеннем нормы. Яна імкнецца дапамагчы і астатнім работніцам асвоіць новую норму выпрацоўкі. Тром маладым работніцам яна перадала свой вопыт, абучыла іх. Маладыя снавальшчыцы Маліноўская, Бок і Навіцкая пры дапамозе тав. Пліс асвоілі норму.

Выдатна працуе таксама старая кадравая работніца тав Лушчэўская, якая прапрацавала на фабрыцы столькі-ж, колькі і тав. Пліс.

Дзякуючы стараниям усяго калектыва ткацкі цэх за трэці квартал пры плане ў 91.557 метраў, выпусціў 112.940 метраў тавару, або 123 проданты плана.

Гэтыя поспехі дасягнуты дзякуючы зладжанай рабоце ўсіх камплектаў. Вядучую ролю пры гэтым адыгрываюць маладыя камандзіры вытворчасці. Узяць, напрыклад, камплект памочніка майстра тав. Ічкоўскага, які састаіць з 38 ткацкіх станкоў. Ён сістэматычна перавыконвае вытворчыя заданні. Вераснёўскі план камплектам выканан на 107 процантаў. Добра працуе таксама камплект, дзе памочнікам майстра тав. Пісарэвіч. Гэты камплект, які састаіць з 19 ворсавых станкоў, выконвае план на 109 процантаў.

У разгарнуўшымся соцыялістычным спаборніцтве цэхаў па дастойную сустрэчу 23-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі адно з перадавых месц займае фарбавальна-апрэтурны цэх. Калектыў гэтага цэха значна перавыконвае свае заданні. Перад аддзелачнікамі стаіць адказная задача — асвоіць выпрацоўку высокасортнага плюшу. І ў гэтай складанай рабоце калектыў дасягнуў нядрэнных вынікаў. Тут асвоілі апрацоўку транспаранта, асвайваецца аддзелка коціка.

Фарбавальна-апрэтурны цэх таксама мае сваіх энтузіястаў соцыялістычнай працы, якія паказваюць прыклады высокапрадукцыйнай работы. Так тав. Савіцкі на працэсе чорнага фарбавання выпрацоўвае ў тры-чатыры разы больш, чым астатнія рабочыя на гэтым працэсе. Тав. Савіцкага цяпер вылучылі памочнікам майстра цэха. Выдатных поспехаў дабіліся тт. Герайкевіч і Мрочка. Яны выконваюць план на 160—170 процантаў.

Фарбавальна-апрэтурны цэх спаборнічае з ткацкім. Да знамянальнай гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі калектыў фарбавальна-апрэтурнага цэха абавязаўся даць звыш месячнай праграмы 8 тысяч метраў ворсавага тавару, 70 процантаў рабочых ахапіць тэхнічнай вучобай.

Няма сумнення, што плюшавікі, якія не раз паказвалі ўзоры высокапрадукцыйнай стаханаўскай работы, прыдуць да слаўнай гадавіны Кастрычніка з новымі вытворчымі поспехамі.

І. Апельбаум.

Узорна падрыхтавацца да зімы

Днямі на адкрытым партыйным сходзе 2-га беластоцкага камбіната быў заслуханы даклад намесніка дырэктара камбіната тав. Юндава аб падрыхтоўцы рабочых памяшканняў да зімы. У сваім дакладзе тав. Юндаў адзначыў, што створаная камісія ў жніўні склала канкрэтны план па рамонту памяшканняў, дзвярэй, перакрыццяў, зашкленню акон і т. д.

Як-жа выконваецца намечаны план?

Камісія па праверцы падрыхтаванасці да зімы ўстанавіла, што намечаныя мерапрыемствы выконваюцца вельмі марудна. Будова тамбураў для дзвярэй, рамонт дзвярэй толькі распачаліся. А да зашклення акон зусім не прыступілі.

У разгарнуўшыхся спрэчках таварышы Бутунаў, Максіменка і іншыя рэзка крытыкавалі будаўнічы аддзел за недастатковую ўвагу да рамонту.

У сваім рашэнні партыйны сход абавязаў дырэктара камбіната да 20 кастрычніка выканаць намечаны план па падрыхтоўцы да зімы і да 25 кастрычніка заслухаць начальніка будаўніцтва аб выкананні намечаных работ.

І. Уколаў.

ЧАМУ АДСТАЕ КАЛГАС ІМЕНІ КАЛІНІНА

Калгас імені Калініна, Шэпетоўскага сельсовета, Чыжаўскага раёна, вырасціў у гэтым годзе высокі ўраджай бульбы — 200 цэнтнераў з гектара. Але-ж добры ўраджай патрабуе своечасовай і хуткай уборкі, каб не дапусціць ніякіх страт. Нельга сказаць, што праўленне калгаса клапоціцца аб уборцы калгаснай бульбы. Уся работа тут пушчана на самацёк, у выніку чаго на 6 кастрычніка ўбрана толькі два гектары бульбы. Калгас яшчэ ні аднаго кілограма не здаў дзяржаве. Большасць калгаснікаў да гэтага часу ўбіралі бульбу з сваіх агародаў.

Працоўная дысцыпліна ў калгасе значна аслаблена. Тлумачыцца гэта тым, што ўчот працадзён забытан. Напрыклад, калгасніца Целецкая выпрацавала ў свой час 55,7 працадзён, а запісалі ёй чамусьці толькі 27 працадзён. Такіх прыкладаў многа.

У калгасе дрэнна знаёмы з статутам сельгасарцелі. Таму ёсць рад выпадкаў грубага яго парушэння. Так, за даенне кароў не налічваюць працадні, а плоцяць грошы па 100 рублёў у месяц. Між тым аднаасобнік Кжэшчук Станіслаў, які часта бывае на рабоце ў калгасе, атрымлівае працадні, калгас корміць яго карову.

Трэба сказаць, што недахопы калгаса праходзяць міма ўвагі дырэкцыі МТС. У гэтым калгасе бывае два разы на тыдні намеснік дырэктара па палітчасці тав. Драмач, але ён ніякай дапамогі не аказвае маладому калгасу.

М. Сідарэнка.

Пісьмы ў рэдакцыю

Як клапоцяцца аб хворых у 2-ой беластоцкай бальніцы

Днямі захварэла мая маленькая дачка. Маці разам з дзіцём накіраваліся ў другую беластоцкую бальніцу для атрымання ўрачэбнай дапамогі. Але ўрачы аднесліся да маці і дзіцяці вельмі лёгкадумна. Замест папярэдняга вызначэння хваробы, іх адразу-ж змясцілі ў заразны аддзел, хаця ні дачка, ні маці не хварэлі ніякай заразнай хваробай.

Калі я на наступны дзень даведаўся аб такіх адносінах да хворых і звярнуўся к урачам гэтай бальніцы, яны спасыліліся на тое, што абласны аддзел аховы здароўя не дапамагае ў адкрыцці ізалятара.

А. Праскурын.

—«0»—

Калі ўстановіцца парадак у гарадскім жыллёвым упраўленні?

Многа кіраўнікоў змянілася ў беластоцкім горжылупраўленні. Спачатку жылупраўленне ўзначальваў Розік; яго змяніў Гарбачоў, Гарбачова—Ланеўскі, Ланеўскага—Палей, але работа вядзецца па-стараму. Людзі прыходзяць, трацяць каштоўны час, але дабіцца якога-небудзь вырашэння пытання нельга. Замест дзелавога адказу, тав. Палей адсылае да свайго намесніка тав. Карнілава, а апошні да свайго кіраўніка і т. д.

Жыллёвая гаспадарка запушчана. На вуліцах Пролетарскай, Свярдлова амаль з кожнага дома цякуць брудныя ручайкі. У дварах горы смецця, але ні ўпраўляючы дома, ні інспектары горжылупраўлення на гэтыя справы не звяртаюць ніякай увагі.

Пры выдачы ордэраў на кватэры па-ранейшаму пануе хаос.

Калі-ж, нарэшце, настане парадак у горжылупраўленні?

М. Б. Казуркін.

—0—

Радыёстудыя ў кухні

Ужо скора год, як у Беластоку абсталяван першы ў заходніх абласцях БССР радыётрансляцыйны вузел. За гэты час установлена ў кватэрах працоўных 400 радыёкропак. Колькасць іх павялічваецца з кожным днём. Калектывам работнікаў радыёвузла праведзена нямала работы па абслугоўванню палітмасавых кампаній.

Аднак Беластоцкі радыёвузел не мае абсталяванай студыі. Важнейшыя перадачы, як «Абласныя апошнія паведамленні», выступленне кіруючых работнікаў, канцэрты мастацкай самадзейнасці, праводзяцца з кухні радыёвузла. У гэтай «радыёкухні» каля пліты і вадаправоднай ракавіны неаднаразова перад мікрафонам выступалі кіруючыя работнікі г. Беластока.

Радыёвузел у сваім распараджэнні мае адпаведнае памяшканне пад студыю, але там трэба правесці драпіроўку сцен. Здавалася-б, што ў тэкстыльным Беластоку можна знайсці неабходны матэрыял для драпіроўкі, але ўсе спробы работнікаў радыёвузла ў гэтым напрамку асталіся безрэзультатнымі.

Па плану, зацверджанаму ўрадам БССР, назначана абсталяваць у Беластоку ў 1940 годзе магутны радыёвузел, які дасць магчымасць абслужыць каля 5 тысяч кватэр працоўных і бліжэйшыя вёскі. На гэта адпушчана 165 тысяч рублёў, уключаючы і выдаткі на рамонт памяшкання радыёвузла. Ужо гатоў праект і каштарыс, ёсць сродкі і асноўная апаратура, але пытанне аб рэканструкцыі радыёвузла да гэтага часу нават не абмяркоўвалася ўпраўленнем сувязі і раённай канторай сувязі.

У чаканні рэканструкцыі апаратура вузла знаходзіцца ў маленькім пакоі, мантаж зроблен часова і не адпавядае правілам тэхнікі безапаснасці.

Да канца года неабходна правесці рэканструкцыю радыёвузла. Патрэбна неадкладная дапамога і ўмяшанне гаркома партыі і горвыканкома ў гэтую справу.

В. Жолі.
работнік абласнога ўпраўлення сувязі.

—0—

Па слядах неапублікаваных пісем

У сваім пісьме ў рэдакцыю нашай газеты тав. Н. паведамляў, што ў Цэханавецкай МТС сістэматычна парушаецца працоўная дысцыпліна, а дырэктар МТС тав. Рыўкін, замест барацьбы з гэтымі з'явамі сам неакуратна прыходзіць на работу.

Як паведамляе беластоцкі абласны зямельны аддзел, факты, змешчаныя ў пісьме, пацвярдзіліся. Прыняты меры да ліквідацыі недахопаў.

Старшы механік Леўчэнка за парушэнне працоўнай дысцыпліны асуджан на тры месяцы. Загадам № 337 па аблза дырэктар МТС Рыўкін атрымаў вымову.

Літаратурная старонка

Філіп ПЕСТРАК

Аб маральным вобліку савецкага пісьменніка

(З даклада на сходзе пісьменнікаў Беластока).

Мы сёння будзем гаварыць аб маральным вобліку нашага пісьменніка. Чаму мы вымушаны гаварыць аб гэтым? Гісторыя-ж не ведае падобных выпадкаў, каб пытаннем маральнасці пісьменніка займаўся ўрад, дзяржава. І гэта зразумела. Пісьменнікі мінулых часоў, выходзячы з нетраў народа, ішлі ў жыццё самапасам, многія з іх гінулі, заставаліся найбольш упорныя і яны самі прабівалі сабе дарогу праз гушчар бяспраўя, хлусні і гвалту над чалавекам. Урады не займаліся лёсам пісьменнікаў. Наадварот, сапраўдныя мастакі праследваліся ўрадамі капіталістычных краін. Так было з Пушкіным, якога ссылалі на ўскраіны Расіі і якога, нарэшце, загубілі, так было з Лермантавым, Дастаеўскім, Шаўчэнка і іншымі, так было з Генрыхам Гейне, якога выгналі з Германіі. Так было з Міцкевічам, які палову свайго жыцця правёў на чужыне, у выгнанні.

Выхавацелем пісьменнікаў у мінулым былі акалічнасці і асобныя людзі. Яркім прыкладам гэтага з'яўляецца А. М. Горкі, які з 12 год пайшоў у жыццё круглым сіратой. Толькі акалічнасці і людзі дапамаглі Горкаму стаць пісьменнікам рабочага класа сусветнай велічыні.

Цяпер мы дажылі, таварышы, да таго шчаслівага часу, аб якім марылі лепшыя людзі ўсіх народаў. Вялікі рускі крытык В. Г. Белінскі жыў у часы, калі не было чыгунак, не было таго, што мы называем культурнымі дасягненнямі. Пры Белінскім была пабудавана першая чыгунка з Масквы ў Пецярбург. І Белінскі, жывучы ў Пецярбургу, штодзённа хадзіў глядзець, як будуецца першы вакзал, глядзець, наколькі ён вырастае за кожны дзень. Чалавек пакутваў за лёс сваёй краіны. Ён цешыўся, гаворачы: «Вось і ў нас будзе свая чыгунка».

Мы цяпер маем шчасце быць сведкамі будаўніцтва не аднаго якога - небудзь вакзала. Мы маем шчасце быць сведкамі будаўніцтва тысяч вакзалаў, чыгуначных і шасейных дарог, каналаў, фабрык, школ, інстытутаў, будаўніцтва цэлых гарадоў, пераходу земляробства на калектыўныя рэйкі.

Героем нашых дзён з'яўляецца сам працоўны народ, які авалодвае ідэямі комунізма, вучэннем Маркса—Энгельса — Леніна — Сталіна. У нас у асноўным пабудаван соцыялізм. Але трэба падняць і самога чалавека на вышыню патрабаванняў соцыялізма.

У перавыхаванні чалавека вялікае месца займаюць людзі мастацкага слова, людзі пяра — пісьменнікі, паэты, крытыкі. Вось тут мы і сутыкаемся з пытаннем аб маральным вобліку пісьменніка. Выхаванне пісьменніка, яго рост не залежаць у нас ад выпадковасцей, ад акалічнасцей. У жыцці і выхаванні пісьменнікаў прымае ўдзел партыя, урад, асабіста таварыш Сталін. Мараль нашага савецкага пісьменніка — гэта мараль соцыялізма. Як у народзе гнездзяцца яшчэ рэшткі капіталістычнай псіхікі, таксама гнездзяцца яны і ў свядомасці некаторых нашых пісьменнікаў. Твор пісьменніка — гэта выказванне яго душы. Значыць у творах такога пісьменніка непазбежна закрадуцца сімпатыі да чаго-небудзь старога, якое асуджана ходам гістарычных падзей.

Усім вядома, што пісьменнік павінен быць усеахапляючым чалавекам, павінен свядома падыходзіць да кожнай рэчы і кожнай з'явы. Як сапраўдны мастак, ён павінен рэагіраваць на ўсё, што знаходзіцца ў яго полі зроку. Асноўным крытэрыем у ацэнцы жыцця з'яўляецца светапогляд. Барацьбой за шчасце чалавецтва (а гэта ідэя павінна быць ідэяй кожнага нашага пісьменніка), барацьбой за соцыялізм кіруе светапогляд Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна. Гэты светапогляд даказаў на справе сваю навуковасць, ён падцвердзіўся і падцвярджаецца самім жыццём. Для ўзбраення сябе гэтым светапоглядам трэба вывучаць марксізм-ленінізм. Без марксісцка-ленінскага светапогляду нельга быць савецкім пісьменнікам.

Маючы за сабой марксісцка-ленінскі светапогляд, мы павінны набыць магчымасць дзейснага (актыўнага) уплыву на жыццё, на выхаванне людзей у духу комунізма. А. М. Горкі гаварыў: «Сэнс 25-гадовай грамадскай работы маёй, як я разумею, зводзіцца да страснага майго жадання ўзбудзіць у людзях дзейсныя адносіны да жыцця». Што гэта значыць? А значыць гэта вось што. У апавяданні «Вывад» Горкі гаворыць, як адзін малады чалавек біззбройны кідаецца на ўсю вёску, якая безчалавечна прыніжала адну жанчыну. Вось гэта і значыць выклікаць дзейсныя адносіны да жыцця.

Маючы правільную ацэнку з'яў нашых дзён, савецкі пісьменнік павінен вывучаць чалавека ў нашым савецкім быту. Чалавеказнаўства Горкі лічыў асновай мастацтва. Пісьменнікі старых часоў жылі ў разладзе з рэчаіснасцю. Рэчаіснасць была горкая, чорная—і яны змагаліся з ёй. Адсюль і вырас крытычны рэалізм. Крытычны рэалізм быў крытыкай асноў грамадскага ладу, самога фундамента і ўсяго таго, што на ім вырасла. Асновы савецкай рэчаіснасці накіраваны на тое, каб ашчаслівіць кожнага чалавека. І мы павінны крытыкаваць усё тое, што супярэчыць гэтым асновам, што засталося ў свядомасці людзей, як спадчына капіталістычнага ладу. У крытычным рэалізме была вялікая сіла крытыцызма, адмаўлення, але мала было сцвярджаючай сілы. Наш рэалізм — гэта соцыялістычны рэалізм, які акрамя сілы крытыцызма, мае вялікую сцвярджальную сілу, бо ён узброен правільнай тэорыяй і практыкай марксізма-ленінізма.

Ці няма ў нашым быту людзей, у якіх існуе разлад між сабою і нашай рэчаіснасцю? Безумоўна, такія людзі ёсць. Гэтыя людзі хацелі-б толькі крытыкаваць часовыя недахопы нашага жыцця, але нічога больш не рабіць, каб гэтыя недахопы знішчыць. Гэтыя людзі трацяць веру ў сцвярджаючую сілу нашага часу. Такія людзі ёсць і сярод пісьменнікаў. Уладаючы такім настроем, яны непазбежна кідаюцца ў абдымкі перажыткаў капіталізма. Яны пачынаюць успяваць разгул ці распуства, успяваць пошласць. Чалавек маральна гіне, калі яго ў час не паправіць.

Таму ад пісьменніка патрабуецца пастаянная пільнасць да кіруючай ідэі часу, каб яе не затуманілі ніякія хвалі. Быць верным ідэі нашага часу — гэта значыць мацаваць яе словам і справай. Для сапраўднага мастака адкрываецца вялікае поле дзейнасці, непачаты край работы. Адточваць сваю зброю павінен пісьменнік, паэт і крытык. «Мастацка і праўдзіва» — павінна быць лозунгам кожнага з нас. Мы павінны памятаць, што кожны герой — гэта тып, але разам з тым, гэта зусім пэўная асоба, якая мае свае індывідуальныя рысы. Нельга схематызіраваць сваіх герояў — гэта будзе хлусня. Хто будзе затушоўваць узнікненне супярэчнасцей і іх перамаганне — той не мастак і нават не фатограф. Хто ў жыцці сваіх герояў будзе весці дзве паралелі: адну нахаве «дабро», а другую «зло» — гэта будзе метафізік, а не марксіст. Трэба зразумець дыялектычны рух з'яў, калі адна параджае другую. Такі працэс дыялектычнага вырашэння супярэчнасцей у жыцці чалавека і прыроды, працэс, які адлюстроўвае сапраўднасці.

Расказаць аб соцыялізме, аб нашых выдатных людзях, аб тым, як нам удалося разбіць у краіне воўчы закон капіталізма і ўстанавіць новы закон жыцця, які грунтуецца на соцыялістычным спаборніцтве, расказаць аб тым, як людзі соцыялізма адстаялі і адстойваюць сваю бацькаўшчыну ад разнастайных і шматлікіх ворагаў, як мы будуем сваю дзяржаву, расшыраючы яе ўплыў і вызваляючы прыгнечаныя народы ад гнёту капіталізма — у гэтым гістарычная місія савецкага пісьменніка. Гэта—галоўны змест яго работы.

Белінскі гаварыў: «Свабода творчасці лёгка ўзгадняецца са служэннем сучаснасці. Для гэтага не трэба прымушаць сябе пісаць на тэмы, насілаваць фантазію, для гэтага трэба толькі быць грамадзянінам, сынам свайго грамадства і сваёй эпохі, засвоіць сабе яго інтарэсы, зліць свае імкненні з яго імкненнямі; для гэтага патрэбна сімпатыя, здаровае практычнае пачуццё ісціны, якое не аддзяляе перакананне ад справы, твора ад жыцця». Белінскі з глыбіні XIX века гэтымі словамі гаворыць нашым часам. І словы яго жывыя цяпер, як ніколі.

На пытанне, што значыць быць пісьменнікам, дае адказ А. М. Горкі: «Быць пісьменнікам — значыць быць чалавекам у самым высокім і прыгожым яго значэнні. А быць чалавекам — значыць быць неразлучным з народам у працы, пакутах і радасцях яго». Вось за такога пісьменніка мы будзем змагацца з вамі штодзённа.

НОВЫЯ ЧЛЕНЫ САЮЗА САВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР



Яўрэйскі паэт Гелер, беларускі паэт Максім Танк і польскі паэт Дэгаль. Фота А. Сапіра.

Максім ТАНК

Над магілай М. БАГДАНОВІЧА

Прагучыць сірэна ў порце часам.
Кіпарысаў дрэмле ціхі сад.
Дрэмле Ялта.
По крутых тэрасах
Льецца вішань белы вадаспад.

Тут вясна асыпала ўсё цветам.
І цяжэй знайсці ўчарашні след,
Хоць над ранніх курганом паэта
Напісалі імя і санет.

Мне шкада, што спазніліся годы,
А твае так рана адцвілі.
Сёння разам выйшлі-б да ўсходу
Прывітаць радзімы караблі,

Рокат мора, збуджанага ветрам,
Аблакоў ключ сіні і зару,
Што з вяршынь аснежаных
Ай-Петры
Кожны дзень плыве на Беларусь.

Кургановў прадвечнага спакою
Кіпарысы вартай сцерагуць...
Але пэўна,
калі гром прыбою
Змоўкне і растане пенай гул, —

Чуеш ты:
як звоняць сосны ціха,
Як палі вітаючы свае,
Недзе ўнучка слуцкае ткачыхі
Пра вясну шчаслівая пяе.

Цімох КРЫСЬКО

Чаканай блізкаю парою...

I.

Яшчэ дзяцінаю зарою
Уведалі мы ласку зброі,
А нас яна.
Дарогамі зямлі ішла вайна.
Паліла нашы азяроды,
Таптала маладыя ўсходы,
І тлела ў прысаку карчом.
Як почварны прывід
Скрыпела з дрэва крумкачом:
— Крыві... Крыві...

II.

Як у чалесніку таган,
Як п'яны канакрад-цыган
Бушуе за сялом шаша
Да болю у вушах:
І дзень і ноч,
І ноч і дзень
Чужое войска ідзе.
Блізка відаць —
Далёка дыбаць.
Цяжка ўцякаць,
Што й казаць.
Скідаюць салдаты патроны
ў жыта,
Ранцы ў траву, пад аткос
пажытак,
Накрадзены ў вёсках,
А паны
Рады-б скінуць і штаны.
У шынелях матчынага скрою
Мы зразумелі сілу зброі.

III.

Мы ворага сляды,
Абочыны дарог
Абпоўзалі тады,
Як бацькаўскі парог.
Дзе гільза, патранташ,
Граната, ці снарад —
Давай яго, ён наш,
Находцы кожны рад.
І назіркам на сцежку
Да гумнаў, да хлявоў.
Там доўга будзе цешыць
Нас патаемны схоў.
Падзелім мы пароўну
Трафеі свае ўсе:
Штыхі — ў страху, патроны —
У мякіну у засек.
Дапытлівыя знаўцы,
Упартыя майстры,
Няхай у нашай працы
Запал той век гарыць.
Мы стрэльбы майстравалі
Без чарцяжоў, без кніг,
Мы шаблі гартавалі
У полі на агні.
Той час у знакі даўся —
Пасек нам твары шрот,
Без пальца хто астаўся —
Не разяўляйце рот!
Далёкай незабыўнаю парою
Зазналі мы паэзію зброі.

IV.

Як подпіс пад клятваю яснай
І лёс мой і час мой.
Ён хвілі суровыя ліча —
Скора пакліча.
Ляжаць у цэйхгаузе роты
Шынель нагатове і боты.
Руплівa рука маладая
Вінтоўку маю даглядае.
Час хвілі імклівыя зліча —
Трубою трывожнаю скліча.
І хлопцы, бярогшыя памяць,
Як ворага клалі упокат снапамі,
Як познія пісьмы да дому пісалі,
Як вераснем золкім хадзілі лясамі,
Скажуць:
— Мы зналі, што стрэнемся,
зналі
І гэтага дня мы заўсёды чакалі.
І гэтай блізкаю парою
Падцвердзіць нашу дружбу
зброя.

Верасень 1940 г.

Пімен ПАНЧАНКА

Першыя кулі

Нябачная першая куля
Ля вуха злавесна свісне.
Зямля ў нябёсы дзьмухне
Крывавай віхурай гранат,
Барвовая душная хмара
Над ціхім акопам навісне,
Таварыш паранены войкне —
І ты зразумееш: вайна.

Маланкай мільгнуць успаміны:
Далёкая вёска... дзяўчына...
Ты слухаеш у трывозе,
Як верба ад страху дрыжыць.
І хочаш зрасціся з зямлёю,
Зрабіцца драбнюткай пясчынкай,
Зарыцца ў чабор духавіты,
Замерці, дыханне стаіць.

Ты бачыш перад вачыма —
Агеньчык маленькай кветкі,
Мурашка з нікчэмнай здабычай
Пабегла кудысьці наўцёк.
Усё, што ты ботамі трушчыў,
Усё, што было непрыкметным —
Варушыцца, звоніць, спявае
І праслаўляе жыццё.

І з самых таемных глыбіняў,
З бушуючых вогненных нетраў,
Прыходзіць загад суровы:
«Устань, чалавек, паглядзі
На родны свой край,
На поле, абмытае сонцам і ветрам,
За ўсё, што стварыў ты
і створыш, —
У бітву адважна ідзі».

І вецер твой рот разрывае
Страшэнным бязгучным крыкам,
Пружыністую і тугую
Зямлю паглынуў агонь.
Бяжыш ты насустрач кулям,
Разгневаны і вялікі,
І тупат пяхотных дывізій
Спяшыць за табой наўздагон.

г. Беласток, 1940 г.

А. БРЭЗІНСКІ

Марыя Жэлезова

(З нядаўняга мінулага)

Некалькі год таму назад я наведаў маё роднае мястэчка. Калі мне надакучыла кружыць па пустых балоцістых вуличках, я зайшоў у аблезлы будынак суда, каб як-небудзь змарнаваць час, што застаўся да адыходу поезда.

У пярэдняй тоўпіліся ў парваных сярмягах панурыя сяляне.

Перад «законам» — маладым польскім суддзёю з шэрымі калючымі вочкамі — стаяла жанчына ў кажусе і нізка насунутай на лоб хустцы. Справа звычайная, якіх шмат бывае ў гэтай мясцовасці: жанчына абвінавачвалася ў пакражы дроў з лесу графа Тышкевіча. Я ўжо было пашкадаваў, што прышоў сюды, у гэты поўцёмны, прапітаны вільгаццю пакой.

Але вось я пачуў імя абвінавачваемай — Марыя Жэлезова— і нешта бліснула ў маёй памяці. Перад вачыма сталі праносіцца вобразы адзін за другім...

Марыя Жэлезова — адзіная дачка рускага народнага настаўніка, прыгажэйшая дзяўчына ў мястэчку — з адкрытым светлым тварам і вялікімі блакітнымі вачыма, як у дзіцяці. Тонкая і стройная, нібы маладая сасна, што расла ля іх хаты па Зарэчнай вуліцы.

Гуляючы па гэтай вуліцы летнімі вечарамі, памятаю, мы— вучні старэйшых класаў, часта сустракалі Марыю з Міколам, сынам паштмейстэра, які вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце. Потым яны ажаніліся. Калі ўспыхнула сусветная вайна, Мікола пайшоў на фронт. А калі фронт наблізіўся да мястэчка, Марыя разам з бацькам-настаўнікам выехала кудысьці ўглыб Расіі.

Дзіўна, усё гэта праносіцца ў маёй памяці, і ў той-жа час я ўлаўліваю, што гэта-ж расказвае падсудная маладому суддзі. Але той суха перабівае яе — усё гэта не мае ніякіх адносін да справы.

— Мае, мае адносіны да справы, — крычыць жанчына. —Калі скончылася вайна і мы з бацькам вярнуліся ў нашу старую хату, я знайшла ў тышкевічаўскім лесе на вайсковым пагосце Міколаву магілку. Мястэчковыя жанчыны, якія нічога не ведалі аб лёсе сваіх мужоў, зайздросцілі мне: я-ж мела ўзгорачак, на якім магла садзіць кветкі і дзе магла выплакацца ўволю.

— Але якія ўсё-ж такі адносіны мае гэта да справы? — ужо злосліва перабівае суддзя.

— Мае! — не сваім голасам крычыць Марыя Жэлезова. — Калі ўжо так, то судзіце заадно і Міколу, вырыйце яго з магілы і судзіце... Так, так, судзіце, бо самы галоўны ўдзельнік майго злачынства — ён. Зімой, кожную ноч, як толькі закрыю вочы, ён з'яўляецца ў нашу нягрэтую хату і сумна ківае галавой: «Мерзнеш, Машанька, што? Мерзнеш са сваім старэнькім бацькам... Што-ж гэта будзе? Беспрацоўны, ні граша, ляжыць ён, стары рускі народны настаўнік, мерзне і стогне... Ах, як мне яго шкада, як мне вас абодвух шкада ў такія вялікія марозы... Паслухай-жа мяне, дарагая, пайдзі ў лес, ды збяры крыху дроў. Ты не маеш права? Ты маеш поўнае права на гэта. Што нам граф Тышкевіч. Я цяпер у лесе, я цяпер гаспадар над лесам... Так, так, галубка, гэта наш лес, наш лес».

І тут Марыя змоўкла. І так засталася сядзець з уздрыгваючымі плячыма, з закрытым тварам.

Суд прыгаварыў: год турэмнага зняволення.

Калі я выходзіў з суда, асенні назойлівы дождждык імгліў над мястэчкам, ператвараючы ў дрыгву і да таго ўжо гразкія вулачкі. Цяжкія хмары паўзлі над мястэчкам. Толькі далёка, над самым гарызонтам, прабівалася пурпурная палоска, супакойвала, уцяшала...

г. Беласток.

Ал. НЁМАНСКІ

Браты

Родныя браты Пятрусь і Лявсей Азукі пасля дзяліцьбы паступова станавіліся ворагамі. Узаемная нянавісць між імі зайшла так далёка, што прымірэнне здавалася немагчымым.

— Замінаюць адзін другому жыццё, — гаварылі пра іх суседзі.

А ўсё пачалося з-за зямлі. З-за пяці дзесяцін, што прышлося разрэзаць на дзве часціны. З-за гародаў, якія ніяк нельга было падзяліць справядліва.

Спачатку гэта былі проста сваркі. Прычым больш сварыліся жонкі. З-за кожнай дробязі і амаль штодзённа. Мужчыны радзей сустракаліся на вузкай сцежцы, але іх сутычкі затое насілі больш глыбокі характар. Сустрэнуцца, паглядзяць воўкам адзін на другога, скрыгануць зубамі, кінуць адзін другому па колкаму слову, і ў сэрцах разгараецца ўсё больш і больш іскра глухой нянавісці, тупой і дзікай злосці.

Хата Пятруся, абымшэлая і крыху згорбленая, урасла ў самы бераг Нёмана. Ляксеева, навейшая і больш зграбная, стаіць воддаль. Раней Ляксей хадзіў за вадою ў Нёман паўз Пятрусёвай хаты. І блізка і зручна. Але Пятрусь праз увесь свой гарод паставіў высокі і моцны плот і гэтым адгарадзіў Нёман ад брата. Не застаўся ў даўгу і Ляксей: ён загарадзіў праход да Пятрусёвай адрынкі, якая стаіць за яго гародам. У дадатак ён зрыў ямы, дзе на працягу некалькіх год Пятрусь захоўваў на зіму бульбу.

Але ўсё гэта дробязь у параўнанні з падзеямі, якія разгарэліся пазней.

Была яркая залатая раніца. Над Нёманам павольна падымаўся празрысты туман. Церпка пахлі росныя кветкі і травы. Жыватворнымі сокамі набухала ралля. Пятрусь шырока шагаў за плугам, заворваючы сваю паласу. Заставалася прайсці яшчэ некалькі баразён, і Пятрусь спыніўся, каб перадыхнуць. А спыніўшыся, уважліва акінуў вокам сваю і братаву палосы, якія раздзяляў вузкі разор. Пятруся штосьці цюкнула. Ён узяў пугаўё і стаў мерыць. Так і ёсць: дзве баразны яго, Пятрусёвай, зямлі заараны Ляксеем. Цвёрдым крокам Пятрусь накіраваўся за ўзгорак, дзе працаваў Ляксей.

...Яны стаялі насупроць, узяўшы адзін другога за грудзі: каранасты, шыракаплечы Пятрусь і высокі, крыху сутулы Ляксей. Яны тузалі адзін другога, імкнучыся зваліць у пульхную раллю. Скрозь парваную кашулю Пятруся відаць былі валасатыя грудзі. Па шчацэ Ляксея змейкай віўся струменьчык ліпкай крыві.

Іх развялі суседзі.

Ляксей — бяздзетны. Не жадаючы, каб пасля яго смерці зямля па законах спадчыннасці дасталася Пятрусёваму сыну, ён усынавіў хлопца з суседняй вёскі. І тады Пятрусь пайшоў на самае агіднае: ён данёс у паліцэйскі пастарунак, нібы Ляксей займаецца рэвалюцыйнай прапагандай, нібы ў яго ёсць зброя, і што прыёмны сын Ляксея падбухторвае сялянскую моладзь на паўстанне. Паліцыя не замарудзіла з'явіцца. У пошуках зброі, паліцэйскія поўразбурылі хаціну Ляксея. Прыёмнага сына Міхася забралі.

Невядома, як-бы скла́ліся ўзаемаадносіны братоў у далейшым, калі-б не верасьнёўскія падзеі 1939 года. Над Нёманам прагрукацелі савецкія танкі. Чырвонаармейскай зоркай узышло новае жыццё над заходнебеларускімі прасторамі.

У сакавіку адбываўся сход сялян вёскі Паднямонне. Ніколі яшчэ спрэчкі не былі такімі гарачымі. Гаварылі многа і заўзята. У прамовах выказвалі ўсё, што набалела за многія годы. І людзі ірвалі іржавыя ланцугі, якія акутвалі старое жыццё. У прамовах вырысоўваліся абрысы чагосьці новага, заманліва прывабнага, хоць і не зусім вядомага.

Адныммі з першых запісаліся ў калгас Пятрусь і Ляксей.

Назаўтра маладыя калгаснікі выходзілі ў поле. З песнямі і чырвонымі сцягамі ехалі яны на палі, зрэзаныя тысячамі меж і разораў. Ехалі нішчыць межы, нішчыць спрадвечныя разоры.

А ўвечары над Нёманам адбылося незвычайнае.

Ля высокага плота на гародзе сталі Пятрусь і Ляксей. Свежы вецер даносіў з-за Нёмана церпкія пахі. Паветра было насычана дзівосным звонам вясны.

Перш, чым узяцца за плот, Пятрусь шырока расставіў ногі, далоняй правай рукі правёў па барадзе зверху ўніз і павольна сказаў, звяртаючыся да брата:

— Разам з гэтым плотам хай назаўсёды знікне наша варожасць. Хай ніхто з нас не ўспамінае мінулага.

Узяўшыся за канцы жардзіны, яны разгойдалі кавалак плота і з размаху кінулі яго з высокага берага. Магутныя нёманскія хвалі лёгка падхапілі прасохшае на вясеннім сонцы дрэва і хутка панеслі яго ўніз па плыні.

З хат выходзілі суседзі і здалёк наглядалі гэту сцэну.

З А Р У Б Я Ж О М

ЗВОДКА ГЕРМАНСКАГА КАМАНДАВАННЯ

БЕРЛІН, 10 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае наступную зводку вярхоўнага камандавання германскай арміі:

«Учора з раніцы і да позняга вечара германскія лёгкія і цяжкія бамбардыроўшчыкі паслядоўнымі хвалямі рабілі бесперапынныя налёты на англійскую сталіцу. Ноччу працягваліся атакі цяжкіх бамбардыроўшчыкаў, якія прадоўжыліся да раніцы 10 кастрычніка. Вялікія пашкоджанні прычынены докам, размешчаным на Тэмзе. Шматлікія разбурэнні зроблены таксама ў самым горадзе, дзе больш усяго пацярпелі транспартныя збудаванні. Ноччу можна былоназіраць шматлікія пажары. Асобныя бамбардыроўшчыкі скінулі бомбы цяжкага калібра на партовыя збудаванні, воінскія лагеры, вакзалы і ваенныя прадпрыемствы Паўднёвай Англіі. У Паўднёвай і Сярэдняй Англіі падвергліся бамбардыроўцы шматлікія аэрадромы. У Сент-Івэл, Пенрхоз і Сент-Мерын у рэзультаце прамога падання бомб разбураны ангары і сховішчы і знішчана некаторая колькасць самалётаў на зямлі. У порце Кардыфа бамбардыроўка выклікала моцныя ўзрывы і вялікія пажары.

На моры германскія самалёты скінулі бомбы на непрыяцельскі гандлёвы параход танажам каля 4 тысяч рэгістравых брута-тон. Параход, у якога быў пашкоджан борт, загарэўся. Адна германская падводная лодка патапіла два ўзброеных непрыяцельскіх гандлёвых судны агульным вадазмяшчэннем у 7 тысяч рэгістравых брута-тон.

Начныя налёты непрыяцельскіх самалётаў на Заходнюю Германію і на акупіраваныя раёны прычынілі нязначныя страты. Разбурана некалькі жылых дамоў. Страты непрыяцеля за ўчарашні дзень склалі 10 самалётаў, з іх 1 самалёт быў збіт зенітнай артылерыяй. 4 германскіх самалёты прапалі без весткі».

Бамбардыроўка Лондана

НЬЮ-ЁРК, 10 кастрычніка. (ТАСС). Паводле паведамлення лонданскага карэспандэнта агенцтва Юнайтэд Прэс, у рэзультаце ўчарашняй германскай бамбардыроўкі ў цэнтры Лондана ўспыхнулі вялікія пажары. Запальваючыя бомбы трапілі на вялікую колькасць будынкаў, у рэзультаце чаго ў горадзе ўзнік цэлы рад пажараў. Відавочна, піша далей карэспандэнт, большасць пажараў удалося хутка ліквідаваць.

У другім паведамленні гэтага-ж карэспандэнта гаворыцца, што ў некаторых кварталах вуліцы пакрыліся бітым шклом і шчэбнем у рэзультаце ўзрываў бомб. Сатрасанне паветра ад узрываў бомб збівала людзей з ног і прыціскала іх к сценам дамоў. На вуліцах валяюцца перавернутыя аўтамабілі. У многіх раёнах пашкоджаны брук і часова спынен рух.

Паводле паведамлення лонданскага карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс, учора ўвечары, а таксама на досвітку 10 кастрычніка германскія самалёты падверглі Лондан інтэнсіўнай бамбардыроўцы. На вуліцах стаіць такі моцны шум, што бывае цяжка адрозніць кулямётную страляніну ад узрываў бомб. Праз 2—3 гадзіны пасля пачатку налёту германскай авіяцыі бомбы былі скінуты ў васьмі раёнах Лондана. Паводле слоў карэспандэнта, гэта быў адзін з самых інтэнсіўных налётаў на Лондан з пачатку вайны.

НАЛЁТЫ АНГЛІЙСКАЙ АВІЯЦЫІ НА ГЕРМАНІЮ

ЛОНДАН, 10 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, у Лондане было афіцыяльна аб'яўлена, што ў ноч на 10 кастрычніка англійская бамбардыровачная авіяцыя зрабіла налёт на ваенныя аб'екты і камунікацыі ў Германіі, а таксама на германскія базы на ўзбярэжжы праліва Ла-Манш і іншыя пункты на акупіраванай праціўнікам тэрыторыі.

БЕРЛІН, 10 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, у ноч на 10 кастрычніка разрозненыя англійскія бамбардыроўшчыкі імкнуліся з боку Галандыі заляцець у Германію, але ў рэзультаце дзеянняў проціпаветранай абароны вымушаны былі павярнуць назад. Скінутыя бомбы не прычынілі ніякага ўрону ваенным аб'ектам.

Забарона на румынскія фонды ў ЗША

НЬЮ-ЁРК, 11 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Асошыэйтэд прэс, міністэрства фінансаў ЗША аб'явіла, што Рузвельт наклаў забарону на румынскія фонды ў ЗША. Із'яцце гэтых фондаў можа быць дазволена толькі міністэрствам фінансаў.

НЬЮ-ЁРК, 11 кастрычніка. (ТАСС). Распараджэнне Рузвельта аб накладанні секвестра на фонды румынскага ўрада і румынскіх грамадзян у ЗША уступіла ў моц з 9 кастрычніка. Па паведамленню агенцтва Асошыэйтэд прэс, агульная сума румынскіх фондаў у ЗША складае, прыкладна, каля 100 мільёнаў долараў.

Заява Чан Кай-шы

ЧУНЦЫН, 10 кастрычніка. (ТАСС). Сёння, 10 кастрычніка, спаўняецца 29-я гадавіна з дня кітайскай рэвалюцыі, якая звергла манархію. Па выпадку гадавіны кітайскай рэвалюцыі Чан Кай-шы зрабіў спецыяльную заяву і звярнуўся з адозвай да насельніцтва і арміі. Гэтыя два дакументы, аналагічныя па сваіму зместу, падкрэсліваюць рашымасць Кітая працягваць супраціўленне.

Закранаючы тройсцвены саюз Германіі, Італіі і Японіі, Чан Кай-шы ўказаў, што «Кітай ніколі не прызнае так званага новага парадку ва Ўсходняй Азіі. Краіны, якія прызналі за Японіяй кіруючую ролю ва Ўсходняй Азіі, будуць у далейшым шкадаваць аб гэтым. Любое пагадненне з Японіяй аб Далёкім Усходзе, пагадненне, супроць якога выступае Кітай, не будзе мець ніякага значэння, таксама-ж як і любое пагадненне паміж Нанкінскімі марыянеткамі і іх гаспадарамі. Гэтае пагадненне будзе толькі кавалкам паперы». Далей Чан Кай-шы заявіў, што Кітай усімі сіламі будзе перашкаджаць Японіі ў яе імкненні заняволіць Усход, паколькі новы парадак азначае захват спачатку Кітая, а затым усяго Ўсхода. «Сёння, на чацвертым годзе вайны, — сказаў Чан Кай-шы, — Кітай уступіў у найбольш цяжкі перыяд. Аднак абстаноўка лепшая, чым у 1911 годзе, калі Кітай рабіў рэвалюцыю. У цяперашні час Японія акружана ворагамі і знаходзіцца на грані распаду. У нас многа прыяцеляў, якія хочуць бачыць Кітай свабодным і працвітаючым. Такім чынам, пытанне заключаецца ў тым, каб нам самім мець упэўненасць і прыкласці ўсе сілы для ажыццяўлення нашых задач».

У заключэнне Чан Кай-шы спыніўся на задачах, якія стаяць перад Кітаем, указаўшы асабліва на неабходнасць умацавання адзінства волі, павелічэння нацыянальных сіл, стварэння моцнай палітычнай асновы развіцця прамысловасці, умацавання эканомікі, умацавання арміі і ўзмацнення нацыянальнай абароны.

Напружаная абстаноўка ў Шанхаі

ШАНХАЙ, 10 кастрычніка. (ТАСС). Паведамленні аб магчымым адкліканні амерыканскіх маракоў з Шанхая і аб эвакуацыі амерыканскіх грамадзян з краін Далёкага Ўсхода сустрэты ў Шанхаі з вялікім занепакоеннем. Хаця амерыканскае консульства ў Шанхаі яшчэ не аддало загаду аб эвакуацыі, абстаноўка ў горадзе надзвычай напружаная. У дзелавых кругах паведамленні аб эвакуацыі амерыканскіх грамадзян і аб магчымым адкліканні амерыканскіх маракоў разглядаюцца як новы доказ падрыхтоўкі ЗША да вайны на Далёкім Усходзе. З раніцы 9 кастрычніка на шанхайскай чорнай біржы назіралася паніка, якая суправаджалася падзеннем курса акцый амерыканскіх кампаній і амерыканскага долара.

Мясцовыя амерыканскія рэзідэнты з занепакоеннем абмяркоўваюць перспектывы эвакуацыі, бо яе ажыццяўленню перашкаджае недахоп транспарта. Білеты на праезд у порты ЗША ўжо распрададзены на студзень месяц. Чакаецца павелічэнне ліку параходаў, абслугоўваючых лінію Кітай — Амерыка. Мясцовыя амерыканскія фірмы распрацоўваюць планы эвакуацыі сваіх служачых і ў першую чаргу членаў іх сем'яў.

Учора раніцай у заходнім раёне Шанхая, акупіраваным японцамі, адбыўся парад японскіх войск. Некалькі сот салдат у парадай форме і ў поўным узбраенні прайшлі па вуліцах горада. Як перадаюць, парад выклікаў вялікі непакой сярод іншаземцаў, пражываючых у гэтым раёне.

У сувязі з адзначаемай сёння гадавінай утварэння кітайскай рэспублікі паліцыя міжнароднага сетльмента і Французскай канцэсіі ўстанавіла на большай частцы вуліц барыкады і паставіла ўзмоцненую ахову. У міжнародным сетльменце, акрамя паліцыі, будуць несці патрульную службу амерыканскія маракі і іншыя воінскія часці, на абавязку якіх ляжыць «прадухіленне магчымых беспарадкаў любога характару».

ДЫСКРЫМІНАЦЫЯ НЕГРАЎ у АМЕРЫКАНСКАЙ АРМІІ

НЬЮ-ЁРК, 10 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе вашынгтонскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, Рузвельт адобрыў парадак, пры якім негры, прызваныя на ваенную службу, аддзелены ад белых салдат. У апублікаванай заяве Белага Дома (рэзідэнцыя прэзідэнта) гаворыцца, што «ваеннае міністэрства ЗША прыняла рашэнне не аб'ядноўваць у адных і тых-жа воінскіх часцях неграў з белымі. Такая палітыка апраўдала сябе на працягу многіх год і ўнясенне змяненняў магло-б прывесці к вынікам, якія аслабляюць маральны стан войск, што нанесла-б урон мерапрыемствам па падрыхтоўцы абароны краіны».



Агульны выгляд лепшага галантарэйнага магазіна № 51 па Савецкай вуліцы ў Беластоку. Фота А. Сапіра.

Безадказныя адносіны да падбору кадраў

— Ці павінен намеснік загадчыка магазіна ўмець чытаць і пісаць? Ці павінен ён умець важыць?

— Дзіўнае пытанне!—скажа чытач,—яно не робіць чэсці таму, хто яго задаў.

Гэта праўда. Аднак, каб апраўдаць сябе перад чытачамі і адначасова высніць прычыны, якія нас пабудзілі задаць такое неразумнае пытанне, мы раскажам у некалькіх словах змест адной справы, якую днямі разглядаў беластоцкі народны суд.

Загадчык магазінам № 137 Беластоцкага горхарчпромгандлю Я. А. Залеўская і яе намеснік І. Х. Бараноўская абвінавачваліся ў тым, што яны з злачыннай халатнасцю адносіліся да сваіх службовых абавязкаў. Згодна абвінаваўчага заключэння, падсудныя прымалі без вагі прысылаемы ім тавар, нясвоечасова яго рэалізоўвалі, што прыводзіла да псавання тавараў.

Які быў вынік такой «дзейнасці», можна сабе лёгка прадставіць. Пры праверцы становішча магазіна ўстаноўлена, што дзяржава панясла страты на суму 4.288 рублёў 48 кап.

У адносінах да Залеўскай абвінавачванне поўнасцю пацвердзілася. Судовым следствам устаноўлена, што падсудная амаль штодзённа забірала ўсю выручку да сябе на кватэру, дзе падлічвала яе і затым толькі здавала грошы ў дзяржаўны банк. Суд прыгаварыў Залеўскую да двух год пазбаўлення волі і адначасова прысудзіў ад яе ў карысць Горхарчпромгандлю суму недахопу па магазіну № 137, гэта значыць 4.288 руб. 48 кап.

Што датычыцца другой падсуднай,—намесніка загадчыка магазіна Бараноўскай, то справа некалькі ўскладнілася. На судзе ўстаноўлена, што Бараноўская... абсалютна непісьменная. Яна нават не мае разумення аб дзесяцірычнай вазе. Калі ёй прыйшлося прымаць тавар у адсутнасці Залеўскай, яна звярнулася за дапамогай да загадчыка суседняга бакалейнага магазіна Еленевіча. Апошні, выступаючы на пасяджэнні суда ў якасці сведкі, расказаў, як, па просьбе Бараноўскай, ён узважваў для яе тавар. Еленевіч заявіў на судзе, што ён не разумее, як гэта можна было назначыць непісьменнага чалавека намеснікам загадчыка магазіна.

Суд вынес у адносінах Бараноўскай апраўдальны прыгавор. Адначасова, у прыватным вызначэнні, суд падкрэсліў злачынную безадказнасць, праяўляемую Горхарчпромгандлем у такім важным пытанні, як падбор кадраў. Набіраючы людзей для свайго апарата, Горхарчпромгандаль зусім не цікавіцца якасцю іх работы і не займаецца павышэннем іх кваліфікацыі.

Вяртаючыся цяпер да пытання, пастаўленага намі ў пачатку гэтай заметкі, а іменна: ці можа быць намеснік загадчыка магазіна непісьменным, — мы не сумняваемся, што Горхарчпромгандаль у самым хуткім часе адкажа на гэта. Калі не нам, то пракурору.

В. Бемаў.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Навуковая сесія Акадэміі навук БССР

12 кастрычніка ў 7 гадзін вечара ў Беластоку, у Доме партыйнай асветы (вул. Талстога, 9), адкрываецца навуковая сесія Акадэміі навук БССР, прысвечаная першай гадавіне вызвалення заходніх абласцей Беларусі ад іга польскіх паноў і капіталістаў.

Работа сесіі будзе праходзіць: 12 кастрычніка з 7 гадзін да 11 гадзін вечара, 13 кастрычніка з 10 гадзін раніцы да 2 гадзін дня і з 6 гадзін вечара да 10 гадзін, 14 кастрычніка—з 7 гадзін вечара да 11 гадзін.

12 кастрычніка будзе прачытан даклад Прэзідэнта Акадэміі навук БССР акадэміка К. В. Горава — «Гадавіна вызвалення Заходняй Беларусі».

Уваход па запрашальных білетах. Білеты раздадзены па арганізацыях.

Аддзел Прапаганды і Агітацыі Беластоцкага гаркома КП(б)Б.

Адказны рэдактар **Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.**

ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛА № 59

ПАСЯДЖЭННЯ АБЛАСНОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА

4 кастрычніка 1940 года. гор. Беласток.

Аб правядзенні тэхнічнага агляду аўта-мота-транспарта.

На падставе пастановы Савета Народных Камісараў Саюза ССР за № 1182 ад 3-га ліпеня 1936 года абласны выканаўчы камітэт п а с т а н а ў л я е:

1. Правесці ў перыяд з 10 кастрычніка 1940 г. па 1 студзеня 1941 г. агляд аўтамашын, матацыклаў, трактараў на гумавым хаду і аўта-прычэпаў, якія належаць установам, прадпрыемствам, арганізацыям і прыватным асобам. Указаны агляд ускласці на Дзяржаўтаінспекцыю Ўпраўлення РС Міліцыі пры НКУС БССР па Беластоцкай вобласці.

2. Абавязаць кіраўнікоў аўтагаспадарак і ўсіх уладальнікаў аўтамашын і матацыклаў у перыяд з 15 кастрычніка 1940 г. па 1 студзеня 1941 г., прадставіць на пункты ў тэрміны, устанаўліваемыя абласным упраўленнем РС Міліцыі, аўта-мота транспарт на агляд у чыстым, акуратным выглядзе і належным тэхнічным стане. Для праверкі забяспечанасці аўта-мота-транспарта на выпадак „П|Т“ трэба мець пры машынах светамаскіровачныя прыстасаванні для фар і стоп—ліхтароў.

3. Тэхнічны агляд аўтатранспарта ў 10 і больш машын вытвараецца непасрэдна ў аўтагаспадарках, а пры наяўнасці ў гаспадарцы менш 10 машын, прадстаўляць іх для агляду на зборныя пункты.

4. З машынамі, якія прадстаўляюцца на тэхнічны агляд, павінны быць прадстаўлены тэхнічныя пашпарты і квітанцыі Дзяржбанка аб уплаце дзяржаўнага збору за тэхнічны агляд (15 руб. за аўтамашыну і трактар на гумавым хаду і 10 руб. за матацыкл і прычэп).

5) Абавязаць кіраўнікоў устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый, а таксама і прыватных асоб, якія маюць аўта-мота-транспарт, у перыяд з 1 кастрычніка 1940 г. прадставіць у Дзяржаўтаінспекцыю пры раённых і гарадскіх аддзелах РС Міліцыі па месцу знаходжання аўтамашын звесткі аб аўтапарку па наступнай форме:

Назва і адрас аўтагаспадаркі ____________

Прыналежнасць да наркамата ____________

№№ п/п	Тып машыны	Марка машыны	Дзяржаўны нумарны знак	№№ бяг. пашпарта	№ шасі	№ рухавіка	Год выпуску	Пройдзена кілометраў	Становішча аўтамашын на хаду (у рамонце бягучым, сярэднім або капітальным)	Месца знаходжання машыны ў аўтагаспадарцы або камандыроўцы

6. За непрадстаўленне на тэхнічны агляд аўта-транспарта, а таксама непрадстаўленне ва ўстаноўлены тэрмін дакументаў, прадугледжаных у пп. 4 і 5 гэтай пастановы, падвергнуць штрафу вінаватых да 100 рублёў.

7. Кантроль за выкананнем гэтай пастановы ўскласці на Дзяржаўтаінспекцыю Ўпраўлення РС Міліцыі НКУС БССР па Беластоцкай вобласці, далажыўшы аб рэзультатах праведзенай работы на пасяджэннях аблвыканкома.

Старшыня аблвыканкома М А Л Ь Ц А Ў.
Адказны сакратар З У Б О В І Ч.

УБ. — 67.

Друкарня Беластокдрук.